***А. А. Андрэйкавец***
*Навук. кір.* ***В. А. Ляшчынская,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## СІМВОЛІКА І КУЛЬТУРНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ З КАМПАНЕНТАМ *ДЗЕСЯЦЬ, ДЗЯСЯТЫ*

Мова, у тым ліку і асабліва фразеалагізмы як самыя «культураносныя» адзінкі яе, даводзіць праз стагоддзі пра вобразнасць мыслення чалавека, маральна-этычныя і эстэтычныя нормы народа, яго жыццёвы і духоўны вопыт, пра тую культуру, што выпрацавана ў далёкім мінулым для яе засваення ўсё новымі і новымі пакаленнямі нашчадкаў.

Для поўнага вывучэння і эксплікацыі культурнай інфармацыі беларусаў на матэрыяле фразеалагічных адзінак (ФА) з лічбавым кампанентам (ужо даследаваны з кампанентам *адзін, два, тры чатыры, пяць* як самыя колькасныя) спынім увагу на ФА з кампанентам *дзесяць, дзясяты*, якія не вызначаюцца частотнасцю ўжывання: дзве ФА з кампанентам *дзесяць* і сем ФА з кампанентам *дзясяты*.

Як можна меркаваць, гэта звязана найперш з пазнейшым увядзеннем гэтых кампанентаў як варыянтных да ўжо існуючых у складзе ФА. Так, у ФА з кампанентам *сем, сёмы*, што з даўніх часоў мела замацаваную сімволіку дасканаласці, вышэйшай ступені, мяжы, значна пазней сталі выкарыстоўвацца варыянтныя *дзесяць, дзясяты*, што набылі гэтую ж сімволіку і сталі служыць для павелічэння ці ўзмацнення гэтага. І ФА з варыянтным лічэбнікавым кампанентам, дзякуючы сімволіцы лічбаў і створаным вобразам, сталі выконваць ролю эталонаў крайняй мяжы стомленасці (*да сёмага / дзясятага поту*), вышэйшай ступені затрачаных сіл (*выціскаць сем / дзесяць патоў*), найвышэйшага стану шчасця, узнёсласці (*на сёмым / дзясятым небе*). А ў ФА *праз дзясятыя / трэція рукі* маем ужо варыянтнасць кампанентаў *дзясятыя / трэція* як сімвалаў аддаленасці, няпэўнасці.

Разам з тым лічба *дзесяць* сама па сабе валодае шырокім спектрам сімволікі, якая і паслужыла яе адбору для ўтварэння ФА. Гэта ФА з парным выкарыстаннем лічэбнікавых кампанентаў *ні ў пяць ні ў дзесяць* як вельмі прадуктыўнай мадэлі ўтварэння ФА (параўнаем *ні села ні пала, ні мяса ні рыба, ні тое ні сёе* і інш.) ці *з пятага на дзясятае, праз пятае на дзясятае, пятае праз дзясятае*, што даводзяць аб неадпаведнасці ні аднаму (*пяць* як эталон цэласнасці), ні іншаму (*дзесяць* як сімвал завершанасці, парадку) і служаць для перадачы стэрэатыпнага ўяўлення пра недарэчнасць, нядбаласць ці даводзяць пра бязладнасць выканання чаго-небудзь на аснове пераскоку пры лічэнні. А ФА *за дзясятай гарой* вобразна перадае эталоннае вымярэнне аддаленасці праз сімволіку неабмежаванай колькасці.

Як відаць, фразеалагізмы з кампанентам апошняга ліку першага дзясятка пры лікавым пералічэння вобразна ілюструюць найперш абстрактныя паняцці праз вобразы ўтвораных адзінак, дзякуючы сімволіцы сваіх лічбавых складнікаў, якім яна была прысвоена ў далёкім мінулым і захавалася ў фразеалогіі.

Такім чынам, фразеалагічныя адзінкі з лічбавым кампанентам *дзесяць, дзясяты* ў беларускай літаратурнай мове не вызначаюцца частотнасцю ўжывання: усяго дзевяць адзінак. Аднак і гэтыя фразеалагізмы ўтвораны ў выніку адбору лічэбнікаў, за якімі замацаваны шырокі спектр сімволікі, якая і выяўляецца ў эталанізацыі і стэрэатыпізацыі гэтых адзінак.

***Ю. А. Арэшка***
*Навук. кір.* ***А. А. Станкевіч,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## МЕТАФАРА І ЯЕ ВЫЯЎЛЕНЧА-ВЫРАЗНАЯ РОЛЯ Ў ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ

Метафара – адзін з самых пашыраных сродкаў стварэння выяўленчай выразнасці тэксту, які актыўна выкарыстоўваецца не толькі ў творах мастацкай літаратуры, але і ў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ